Бо тое, што сёння адбываецца ў Беларусі, – гэта імклівы рух назад, да савецкай сістэмы. Добра знаёмай для сённяшняга кіраўніка па гадах яго маладосці. Камфортнай для незмяняльнай улады, дзе не было і не магло быць прэтэнзій і іншадумства, дзе на любы заклік улады у грамадства мог быць толькі адзін адказ: «Горача ўхваляем і аднадушна падтрымліваем». Дзе правадыр калі і пакідаў свой пост, то толькі на катафалку і пад гукі жалобнага маршу.

Зусім магчыма, што 15 сакавіка сёлета – апошні раз, калі ў Беларусі адзначаюць Дзень Канстытуцыі менавіта ў гэты дзень. Праз год у краіне, як абяцаюць улады, будзе новая Канстытуцыя, а значыць, імаверна, і новая дата яе адзначэння. У хуткім часе, хутчэй за ўсё, з'явіцца праект і пачнецца «ўсенароднае абмеркаванне».

«Усенароднае абмеркаванне» па-савецку

Як гэта можа адбывацца, асабіста я добра памятаю.

У 1977 годзе, паводле афіцыйных звестак, у ходзе «ўсенароднага абмеркавання» новай савецкай Канстытуцыі адбылося паўтара мільёна сходаў, у якіх узялі ўдзел 140 мільёнаў чалавек (80% дарослага насельніцтва СССР). Паступіла 400 тысяч паправак і прапаноў. Прапаноўвалася, сярод іншага, устанавіць усім аднолькавыя пенсіі і абавязаць усіх грамадзян выпускаць прадукцыю толькі высокай якасці... Ледзь не самым спрэчным з'явілася пытанне: як больш дакладна называць Саветы – Саветамі дэпутатаў працоўных ці Саветамі народных дэпутатаў? Нейкіх больш значных спрэчак не здаралася...

Публічна патрабаваць рэальных дэмакратычных свабод ці справядлівых выбараў, наколькі вядома, ніхто са 140 мільёнаў чалавек не спрабаваў.

Падчас прыняцця новай Канстытуцыі дэпутаты на адмысловай сесіі Вярхоўнага Савета СССР у кастрычніку 1977 года дружна называлі яе «сімфоніяй розуму і шчасця» і «самай запаветнай, самай галоўнай кнігай, якую прагне чытаць кожны чытач». Імя Леаніда Брэжнева згадвалася ў кожным выступленні ў сярэднім шэсць разоў. Яго называлі «*натхняльнікам і стваральнікам Канстытуцыі, якая ад першага да апошняга радка прасякнута яго́німі думкамі і пажаданнямі, па-ленінску глыбокімі і яснымі, даступнымі разуменню кожнага чалавека*». Але ўсіх апярэдзіў у гэтай справе першы сакратар ЦК кампартыі Латвіі Аўгуст Вос: ён здолеў згадаць імя Леаніда Ільіча 12 разоў на працягу 3-хвіліннага выступлення.

7 кастрычніка 1977 году нас, школьнікаў, знялі з аднаго з урокаў і на ўрачыстай лінейцы на працягу 45 хвілін тлумачылі, якая вялікая падзея адбылася ў краіне. «Вялікай падзеяй», зрэшты, былі задаволены далёка не ўсе, бо выхадны дзень 5 снежня, які да 1977 года святкаваўся як Дзень Канстытуцыі, у гэты год адмянілі.

Калі савецкая традыцыя цалкам адновіцца, то зусім лагічна, што дзень новай лукашэнкаўскай Канстытуцыі можа стаць непрацоўным. Як дзень сталінскай Канстытуцыі 5 снежня і брэжнеўскай – 7 кастрычніка. І будзе адзначацца з феерверкамі, парадам і хакеем.

(Радыё Свабода)

СУМНА!

Беларусь можа чакаць тое ж, што і Эфіопію

Reuters апублікаваў аналітычны матэрыял пра рост дзяржаўнага доўгу розных краін свету. Напрыклад, даўгі Эфіопіі чакае рэструктурызацыя па праграме G20 «Common Framework», але краіне давядзецца аб'явіць дэфолт. Беларусь знаходзіцца прыблізна на тым жа ўзроўні.

Старшы эканаміст Tellimer **Патрык Каран** вызначыў групу краін з уразлівай эканомікай, чый дзярждоўг расце і каму ўсё складаней рабіць выплаты па пазыках. У гэты спіс трапілі Ямайка, Туніс, Эквадор, Лаос, Бахрэйн, Шры-Ланка, Эфіопія, Аман і Беларусь.

Сярод дадатковых фактараў рызыкі ў памянёных краінах – нізкія тэмпы вакцынацыі ад кавіда.

Аналітыкі канстатуюць, што вынік палітыкі Лукашэнкі – кволая эканоміка на мяжы дэфолту. Далейшае знаходжанне нелегітымнага прэзідэнта ва ўладзе немінуча вядзе да краху эканомікі.

Такое месца ў падобным рэйтынгу сведчыць пра глыбокі сацыяльна-эканамічны крызіс. Таксама гэта чарговы сур'ёзны сігнал беларускаму грамадству аб неабходнасці дабівацца хутчэйшага сыходу нелегітымнай улады. Толькі тады дэмакратычны ўрад, які будзе складацца з прафесіяналаў, зможа вывесці краіну з эканамічнага крызісу.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
19 САКАВІКА 2021 г.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ



Прапала ў «бунтара» зарплата, ды бел-чырвонай будзе хата

Жыхар вёскі Алешча Полацкага раёна Анатоль Каханчык пафарбаваў сваю хату ў белы і чырвоны колеры. Спряша яго асудзілі на 7 сутак арышту за "несанкцыянаваны пікет", а потым звольнілі з работы (38 гадоў вясковец адпрацаваў брыгадзірам на чыгунцы). Мужчына не губляе аптымізму: "Улетку пойдуць грыбы і ягады, так што не прападу…"

Дурноты ў нас цяпер багата,
З яе смяецца цэлы свет.
Хіба ж не дур, што нават хата
Нядаўна зладзіла пікет?
Само сабою, пра такое
Не гаварылася ў судзе,
Бо ў міліцэйскім пратаколе
Аб тым размова не ідзе.
Аднак жа менавіта хата
Па сутнасці крыніца зла.
Яна, зараза, вінавата,
Што "экзекуцыя" была,
Калі закона служкі "суткі"
Далі яе гаспадару.
"Суд на расправу зараз хуткі:
Пратэст "вярхам" не па нутру,
І ў бунтароў "ляцяць галовы".
А як спачатку ўсё было?
Нейк парашыў мужык вясковы
Пафарбаваць сваё жытло.
І даў падказку клёк ягоны:
"Калі такі бунтарскі час,
Дык колер белы і чырвоны
Для хаты будзе самы раз,
Бо то ж мая, прынамсі, хата,
І пафарбую, як хачу".
І на душы адчуў ён свята
Ад бел-чырвонага ўваччу!
Але душа нядоўга пела –
Замоўкла, бедная, калі
Туды служакі з райаддзела
Аж цэлай хеўрай прыбылі.
І справа дзіўная такая
Дайшла напотым да суда…
Але па свеце не блукае
(Гавораць так) адна бяда.
Хоць і не крыў начальнік матам,
Затое гыркаў, быццам звер:
– Дык у цябе, прачуў я, хата
Чырвона-белая цяпер?
Дамогся ўсё-такі свайго ты…
Ды толькі з гэтае пары
Тут для цябе няма работы,
Бо нам не трэба бунтары.
І недавер яшчэ ў пaглядзе
Да "бунтара", як быццам ён
І цягнікі назло уладзе
Пускаў бы заўтра пад адхон.
Ён атрымаў двайную кару,
І далягляд зусім благі…
Гарэлкай ад такога ўдару
Заліў бы хто-ніхто мазгі,
Каб паступова "ласты скласці".
А "пратэстант" і ў вус не дзьме,
І нечаканыя напасці
Трымаць не хоча ён наўме.
Гаворыць:
– Страціў я зарплату,
Але не пагубіў душу.
А летам у красуню-хату
Грыбоў і ягад панашу…
***
Удзячным лёсу быць павінны
Што з бел-чырвонага жытла
Суд не рашыў зрабіць руіны
Або спаліць яго датла…

Дзе ключы?

Перавярнулі вы, лічы,
Кватэру, каб знайсці ключы.
Аднак жа іх няма нідзе.
А час бязлітасна ідзе…
І што рабіць?
І быць вам як?
Найперш расцісніце кулак –
І вы шчаслівыя даволі:
Ключы – на вашае далоні…

Не вылечыць, дык забыць

Дзядуля думку мне данёс
Сваімі яснымі вачыма:
Хоць нельга вылечыць склероз,
Ды пра яго забыць магчыма…

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Як інжынер-праграміст спрабуе легалізаваць незалежны прафсаюз на дзяржаўным прадпрыемстве

Апошнім часам актывізаваліся высілкі па стварэнні прафесійных суполак, альтэрнатыўных афіцыйнай Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. На думку ініцыятараў, афіцыйная арганізацыя цалкам дыскрэдытавала сябе падтрымкай цяперашняга рэжыму.

Як паказвае практыка, легалізавацца не так проста. Масавымі затрыманнямі завяршылася ўстаноўчая канферэнцыя «Лігі студэнцкіх аб'яднанняў» у Мінску, пагрозамі і шантажом суправаджаюцца спробы выхаду з профільных пярвічак у дзяржаўных структурах.

Паказальнай гісторыяй (не)рэгістрацыі арганізацыі ў складзе Беларускага незалежнага прафсаюза на ААТ «Пеленг» са *Свабодай* падзяліўся вядучы інжынер-праграміст **Андрэй Дзечка**. Паводле яго слоў, пакрокавае апісанне можа стаць карысным для тых, хто толькі пачынае баталіі за незалежныя прафсаюзныя аб'яднанні.

«Адмова ў рэгістрацыі арганізацыйных структур прафсаюза не прадугледжана законам»

Як расказаў Андрэй Дзечка, на фоне падзей жніўня 2020 года шэраг работнікаў флагмана оптыка-механічнай прамысловасці выйшлі з «Белпрафмаша» – структурнага падраздзялення праўладнай ФПБ. Ён у ліку першых.

«Спачатку чатыры чалавекі напісалі заявы на ўступленне ў Беларускі незалежны прафсаюз – такім чынам, на нашым прадпрыемстве ўжо арганізавалася прафсаюзная суполка. У верасні колькасць жадаючых папоўніць шэрагі БНП вырасла, і, згодна са статутам, назбіраўся неабходны мінімум для стварэння нізавой прафсаюзнай арганізацыі, а менавіта 10 чалавек», – удакладняе суразмоўца.

21 верасня адбыўся арганізацыйны сход па стварэнні «пярвічкі» Беларускага незалежнага прафсаюза на ААТ «Пеленг». Выбралі раду прадстаўнікоў і кантрольна-рэвізійную камісію – усё, што патрабуецца для легалізацыі статусу.

Пасля падачы матэрыялаў у выканаўчае бюро БНП юрысты падрыхтавалі дакументы для рэгістрацыі ў адміністрацыю Маскоўскага раёна Мінска (юрыдычны адрас на падведамаснай тэрыторыі).

Роўна праз месяц – апошні тэрмін прыняцця рашэння, вызначаны законам, – адтуль запатрабавалі арыгінал пратакола арганізацыйнага сходу. Маўляў, простай выпіскі, завеpанай кіраўніцтвам прафсаюза, недастаткова. Пажаданне чыноўнікаў выканалі неадкладна.

А яшчэ праз месяц маўчання (апошняя дэкада лістапада) прыйшла адмова ў рэгістрацыі – *«у сувязі з адсутнасцю агульных інтарэсаў створанай нізавой арганізацыі з кірункамі дзейнасці БНП»*. Паколькі другім пунктам было пазначана, што рашэнне можа быць абскарджана ў судзе, такім правам заяўнікі пазней скарысталіся.

«Смешна нават чытаць, што прафесійныя інтарэсы членаў БНП, якія жадаюць арганізавацца ў нізавую арганізацыю, не супадаюць са сферай дзейнасці незалежнага прафсаюза. Цалкам выдуманая прычына, абы толькі нейтралізаваць патэнцыяльнага канкурэнта. Бо яшчэ весялей выглядае тое, што адмова ў рэгістрацыі арганізацыйных структур наогул не прадугледжана законам. Гэта значыць, мясцовая адміністрацыя мусіць падпісаць паперу як дадзенасць, не задаючы некампетэнтных пытанняў», – падкрэслівае Андрэй Дзечка.



«Суд не прымае іск са спасылкай на непадведамаснасць спрэчкі»

Актывіст, спасылаючыся на першакрыніцу – інструкцыю Міністэрства юстыцыі «Аб парадку афармлення і разгляду дакументаў, звязаных з дзяржаўнай рэгістрацыяй прафесійных саюзаў», удакладняе, што ў рэгістрацыі новага прафсаюза фармальна могуць адмовіць на пяці падставах:

– парушэнне вызначанага парадку стварэння прафсаюза, самавольныя змены ў статуце ці сімволіцы;

– разыходжанне мэт, задач, метадаў работы, тэрыторыі дзейнасці з патрабаваннямі заканадаўства;

– непадача прадугледжаных дакументаў, неабходных для дзяржаўнай рэгістрацыі;

– неадпаведнасць назвы, у тым ліку скарочанай, сімволікі, а таксама ўмоў сяброўства ў прафсаюзе;

– невыкананне ў месячны тэрмін патрабаванняў, указаных у рашэнні аб адтэрміноўцы дзяржаўнай рэгістрацыі.

Але іх выпадак у гэты пералік не трапляе, пра «несупадзенне прафесійных інтарэсаў» не сказана ні слова, зазначае Андрэй Дзечка. Згодна з законам, на які так любяць спасылацца чыноўнікі, адмовіць у рэгістрацыі арганізацыйнай структуры прафсаюза раённыя адміністрацыі не могуць паводле свайго статусу. І вось на якой падставе:

– арганізацыйныя структуры прафсаюзаў, надзеленыя ў адпаведнасці са статутамі прафсаюзаў правамі юрыдычнай асобы, падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі;

– арганізацыйныя структуры прафсаюзаў, не надзеленыя правамі юрыдычнай асобы, падлягаюць пастаноўцы на ўлік.

«Згадаўшы пра тое, што рашэнне не можа быць абскарджана ў судовым парадку, летась 18 снежня мы падалі іск у суд Маскоўскага раёна Мінска. І што ў выніку? Менш як праз тыдзень суддзя выносіць вызначэнне з адмовай у пачатку грамадзянскага справаводства з прычыны... «непадведамаснасці спрэчкі суду». Гэта як? Звяртайцеся ў суд – ну звярнуліся. А там – «не наша справа», – абураецца Андрэй Дзечка.

Пакуль пастанова не набыла законную моц, 22 студзеня актывісты падалі прыватную скаргу ў Мінскі гарадскі суд. 4 лютага справу разгледзелі, рашэнне суда Маскоўскага раёна пакінулі ў сіле.

«Гендырэктар не ўбачыў супярэчнасці ў дзейнасці іншага прафсаюза»

Такім чынам, падсумоўвае Андрэй Дзечка, і Мінскі гарадскі суд таксама адмовіў рабочым «Пеленга» ў праве адстойваць свае законныя інтарэсы. Наступная інстанцыя – старшыня Мінскага гарсуда. Скарга пададзена, ініцыятары шматпакутнай пярвічкі чакаюць разгляду і рашэння.

Андрэй Дзечка звяртае ўвагу, што нават кіраўніцтва прадпрыемства не мела вялікіх прэтэнзій да з'яўлення пад яго дахам альтэрнатыўнага прафсаюза, хоць спачатку сапраўды крыху «напружылася».

«Актыўнасць не прайшла незаўважанай, выклікаў на гутарку дырэктар: навошта яшчэ адзін прафсаюз ды яшчэ незалежны? Я супакоіў, што гэта не палітыка, гаворка пра законныя правы работнікаў. Адзначыў шэраг недахопаў у калектыўнай дамове, якія гадамі не вырашаюцца ў межах дзяржаўнага прафсаюза. Ну і генеральны ўрэшце даў дабро на такую дзейнасць. А вось што да рэакцыі раённай адміністрацыі, дык яна прадказальная ў сваёй прымітыўнасці. Пры тым што, паўтаруся, іх функцыя – не «прыняць» ці «адмовіць», а проста зарэгістраваць. Могуць толькі вярнуць дакументы на выпраўленне памылак».

Любое парушанае права можа і мусіць аднаўляцца ў судовым парадку. *«Для чаго інačай наогул гэта галіна ўлады?»* – задаецца рытарычным пытаннем суразмоўца.

Пры гэтым Андрэй Дзечка не выключае, што цяперашняя актыўнасць можа мець сумныя наступствы найперш для яго.

МНЕНИЕ ПРОСТОГО ЧЕЛОВЕКА

Чтобы не попасть в ловушку очередной своры политических мошенников и выродков

Впервые на моей памяти белорусы так дружно восстали против беспредела власти, против наглой лжи и не менее наглого мошенничества, против чиновничьего хамства и неуважения к собственному народу. Люди восстали против насилия и беззакония, против попрания элементарных прав человека и гражданина. Белорусы массово вышли на мирные демонстрации протеста. Без оружия. Без средств защиты. И это далеко не толпа «обкуренных отморозков», «уголовников» и «проплаченных провокаторов». Это – граждане нашей страны, которые выступили за восстановление справедливости, попранной беспрецедентными фальсификациями на президентских выборах. Это – сознательные (*сапраўды свядомыя*, а не "*так званыя*") патриоты Беларуси, которые хотят, чтобы их дети и внуки, родные и близкие жили в свободной демократической стране, которые не хотят находиться под дубинками и дулами автоматов.

Будет больно и обидно, если сегодняшняя энергия народных масс уйдет в свисток. Наши дети и внуки не простят нам, если мы не сможем сегодня отстоять для них право жить в родной стране, свободной от насилия и хамства, циничной лжи и попрания прав человека.

Лично я не являюсь сторонником шествий и демонстраций, забастовок и провоцирования органов правопорядка. Благие намерения и эмоции очень быстро иссякают. Поэтому – и это мое непоколебимое убеждение – мы все должны вооружаться Словом и Знанием. Это оружие можно найти в любой библиотеке, в любом книжном магазине. В первую очередь это Конституция Республики Беларусь. Это Избирательный кодекс Республики Беларусь. Это Закон о местном управлении и самоуправлении. Это Закон о статусе депутата. Это наше единственное бескровное оружие.

Мы имеем право требовать по завершении каждой избирательной кампании от тех же депутатов всех уровней ознакомления с итоговыми протоколами, начиная с участковых комиссий и заканчивая ЦИКом. На основании Избирательного кодекса народ также имеет право досрочного отзыва своих представителей во власти, если они не хотят слушать и слышать своих избирателей.

Это трудный и долгий путь. Но если мы все, кто действительно хочет мира и процветания для родной Беларуси и ее граждан, изберем путь закона и справедливости, мы сможем уберечь наших детей и внуков от попадания в ловушку очередной своры политических мошенников и выродков.

Николай ВИТИКОВ, экс-депутат сельского Совета, отец двух дочерей, дед троих внуков и одной внучки.
д.Терюха Гомельского района.

УЧЫНАК

«Я больш не магу там працаваць...»

*Як вядома, да забастоўкі на ААТ «Гродна Азот» далучылася інжынер-хімік з 20-гадовым стажам **Наталля Шавейка**. Яна распавяла «Народнай Волі», чаму пайшла на гэты крок.*

Наталля Шавейка стала 38-м работнікам «Гродна Азот», які далучыўся да забастоўкі. Гэтае рашэнне яна прыняла 15 сакавіка.

Свой учынак тлумачыць проста: *«Я не магу больш там працаваць»*.

– Напісала заяву, што далучаюся да страйкоўцаў, і аднесла ў адміністрацыю прадпрыемства. А там пачула: гэта палітычны крок. А я ў адказ: проста не магу выконваць свае службовыя абавязкі, бо не разумею, дзеля чаго я працую, – расказвае жанчына.

Калі інфармацыя аб далучэнні Наталлі да стайку распаўсюдзілася на прадпрыемстве, многія сталі выказваць ёй падтрымку. Але браць прыклад з яе пакуль не адважваюцца.

– *Мне гэта цяжка патлумачыць*, – кажа спадарыня Шавейка. – *З аднаго боку, падтрымліваюць, а з другога – нічога не робяць дзеля таго, каб змяніць сітуацыю.*

Спадарыня Наталля працавала ў лабараторыі, дзе праводзіцца кантроль над прамежкавым і канчатковым прадуктам вытворчасці. У 2019 годзе яна распрацавала новую методыку вымярэння працэнта кантактавання ў вытворчасці сернай кіслаты. Гэта распрацоўка была прадстаўлена на конкурс «Ідэя года», які праводзіўся на прадпрыемстве. У параўнанні з ручным метадам вымярэння яе прапанова значна павялічвае прадукцыйнасць працы і паляпшае ўмовы работы.

У 2020 годзе Шавейка пачала рэалізоўваць сваю ідэю непасрэдна на вытворчасці, але жнівеньскія падзеі спынілі важную працу.

– *У мяне быў шок, я не магла нічога рабіць*, – згадвае спадарыня Наталля. – *Не было жадання нават падыходзіць да газааналізатара. Усё валілася з рук, калі стала вядома, што людзей забіваюць, кідаюць у турмы.*



Наталля з сумам заўважае, што яе ідэю будзе ўкараняць ужо нехта іншы. Яна засмучана тым, што настроі ў людзей змрочныя:

– Усе толькі скардзяцца на ціск з боку начальства, але па сутнасці нічога не прадпрымаюць для адстойвання сваіх правоў.

Жанчына са шкадаваннем заўважае, што рабочыя не разумеюць сваёй ролі ў набліжэнні тых станоўчых перамен, без якіх жыццё беларусаў не палепшыцца.

Міхал КАРНЕВІЧ.
Гродна.

ВЕРДЫКТ

Больш за 8 гадоў зняволення за перапіску ў чаце

Днямі суд Смаргонскага раёна агучыў прысуд па крымінальнай справе супраць жыхара мястэчка Гальшаны **Івана Вярбіцкага**.

Мужчыну абвінавацілі адразу па некалькіх артыкулах: падбухторванне да акта тэрарызму, незаконныя набыццё, захоўванне боепрыпасаў і выбуховых рэчываў, а таксама знішчэнне афіцыйных дакументаў.

Справу разглядала суддзя **Людміла Пятрова**, дзяржаўны абвінаваўца – пракурор **Сяргей Кавальчук**.

Згодна з матэрыяламі справы, 14 кастрычніка 2020 года ў мэтах *"дэстабілізацыі грамадскага парадку Вярбіцкі размясціў у адной з груп паведамленні з заклікамі да пашкоджання "кактэйлямі Молатава" будынка КДБ і пракуратуры Ашмянскага раёна. У той жа дзень у Telegram-канале пад нікам "Dimon D" ён заклікаў знішчаць маёмасць супрацоўнікаў праваахоўных органаў"*.

15 сакавіка Іван Вярбіцкі выступіў з апошнім словам, прызнаўшы віну толькі ў пашкоджанні пастановы наператрус. Таксама прапанаваў суду пачаць крымінальную справу супраць дзяржаўнага абвінаваўцы **Сяргея Кавальчука**, які першапачаткова прасіў для яго 9,5 года калоніі.

Выніковы вырак:

– за падбухторванне да акта тэрарызму (ч.1 арт.289 КК) – 8 гадоў калоніі;

– за знішчэнне пастановы на ператрус (ч.1 арт.377 КК) – 2 месяцы калоніі;

– за незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў (арт.295 КК) – апраўданы.

Канчатковае пакаранне – 8 гадоў і 1 месяц калоніі ўзмоцненага рэжыму.

РЕЗОНАНС

«Последний раз так принимали Далай-ламу»

Чего добилась Тихановская на переговорах с властями стран Европейского Союза

Советник лидера белорусской оппозиции **Франак Вячорка** рассказал, что последние официальные визиты Светланы Тихановской в европейские страны дали хороший результат.

*«Зарубежные поездки – это инвестиции в будущее. Мы проводим одну встречу, какой-то разговор, звонок, а эффект от этого звонка может быть и сейчас, и через месяц, и через полгода. Короткий звонок **Майклу Макфолу**, бывшему послу США в России, привел к тому, что сейчас он каждый день говорит про Беларусь»*, – уточнил Франак Вячорка подходы к внешней политике в штабе Светланы Тихановской.



По его словам, в Финляндии были встречи с президентом, премьер-министром и министром иностранных дел.

«Последний раз там так принимали Далай-ламу десять лет назад. Мы говорили о том, чтобы Финляндия организовала переговоры о выходе Беларуси из кризиса и поддержала Беларусь в ОБСЕ. У Финляндии всегда была особая роль в ОБСЕ», – поделился Франак Вячорка.

«В Финляндии мы договорились создать экспертные группы, куда могут попасть представители Координационного совета, Евросоюза, России и, возможно, режима Лукашенко, чтобы мы могли найти сценарии мирного выхода из кризиса. Финляндия целиком и полностью на нашей стороне. У нас есть и их солидарность, и конкретные планы поддержки», – подчеркнул политик.

Франак Вячорка утверждает, что 10 лет назад Португалия блокировала санкции против Лукашенко, а *«сейчас делает всё возможное для победы белорусов»*.

«Португальцы ничего не знали о Беларуси до прошлого лета. Но в августе белорусский народ поставил Португалию на уши. Когда Светлана приехала в эту страну, ее чуть ли не носили на руках все национальные СМИ. Печатная пресса снова ставила белорусов на первую полосу», – поделился впечатлениями от поездки советник лидера оппозиции.

По его словам, Светлана Тихановская в Португалии должна была встретиться только с министром иностранных дел, но, когда информация просочилась в прессу, с ней захотели встретиться все: и бывший председатель Еврокомиссии Жозе Баррозу, и премьер-министр Антониу Кошта.

«В молодости он боролся против диктатуры Салазара. И сейчас всей душой хочет опыт своей борьбы и победы передать Беларуси», – рассказал Франак Вячорка.

«Очень важно, что прямо сейчас главой ЕС является Португалия. И португальцы пообещали, что будут вносить Беларусь в повестку дня в Брюсселе на каждой встрече министров и премьеров», – передает пресс-служба слова советника Тихановской.

Говоря про визит в Швейцарию, Франак Вячорка рассказал, что Швейцария перестала быть нейтральной в белорусском вопросе.

«Когда приехала Светлана Тихановская, вся пресса спрашивала про Херше и о том, чем Швейцария может помочь белорусам. Ответ был простой: давлением на режим и заморозкой счетов его «кошельков». На следующий день Светлана приходит в швейцарский МИД, а там один из руководителей МИД отвечает, что все документы готовы и над всеми нашими просьбами уже работают», – рассказал Франак Вячорка.

По его словам, уже идут расследования и поиск счетов «кошельков» Александра Лукашенко.

«Те, кто попал в третий пакет санкций, больше не смогут прятать деньги в Швейцарии. Ситуации, когда после победы народа вся казна окажется за границей, в Беларуси не будет», – рассказал Франак Вячорка.

ЭЎРЫКА!

Экалагічнае авіяпаліва з харчовых адкідаў

Навукоўцы распрацавалі новы падыход да вытворчасці авіяпаліва з харчовых адкідаў. Паводле меркавання экспертаў, гэта значна скароціць выкіды вуглякіслага газу падчас палётаў.

На сёння большасць харчовых адкідаў пераварваецца ў метан. Аднак навукоўцы з ЗША знайшлі спосаб ператварыць гэтыя адкіды ў адзін з тыпаў парафіну, якім можна запраўляць рэактыўныя рухавікі.

Эксперты сцвярджаюць, што такое паліва можа значна скараціць выкіды парніковых газаў у параўнанні з традыцыйным палівам з выкапнёвых крыніц. Гэта эфект забяспечваецца скарачэннем выкідаў вугляроду ад самалётаў і змяншэннем колькасці харчовых адкідаў, якія выдзяляюць парніковыя газы на сметніку, піша *BBC*.

Авіяцыйная прамысловасць ва ўсім свеце сутыкаецца са складаным пытаннем: як задаволіць попыт на палёты, які значна ўзрасце пасля зняцця абмежаванняў, і ў той жа час хутка скараціць вугляродныя выкіды ў гэтым сектары.

Каб стварыць экалагічнае авіяпаліва, навукоўцы спыняюць працэс ператварэння харчовых адкідаў у метан. У выніку яны атрымліваюць лятучыя тлустыя кіслоты, а не CH_4. Затым даследчыкі з дапамогай каталітычнай канверсіі змяняюць лятучыя тлустыя кіслоты на два розныя тыпы парафіну. Пасля гэтыя два тыпы змешваюцца, і да звычайнага авіяпаліва дадаецца 70% такой сумесі. Атрыманае авіяпаліва значна больш экалагічнае і адпавядае ўсім крытэрыям якасці.

Яшчэ адна перавага такога паліва – скарачэнне колькасці сажы на 34%. Сажа спрыяе ўтварэнню кандэнсацыйнага следу самалёта, які ўтварае парніковы эфект.

Даследчыкі плануюць пашырыць вытворчасць экалагічнага авіяпаліва і правесці тэставыя палёты ў 2023 годзе.

(NN.by)

БУДЬТЕ ЗДОРОВЫ!

Медики назвали один из самых полезных продуктов для сердца

Он улучшает функции кровеносных сосудов на 47 процентов.

Американские медики из Калифорнийского университета и их немецкие коллеги из Университета Генриха Гейне провели исследования, которые показали, что ежедневное употребление какао, обогащенного флаванолами, удваивает количество циркулирующих в крови ангиогенных клеток, пишет *u-news.com.ua*.



По их словам, эти клетки как бы «ремонтируют» сосуды и поддерживают их функции, способствующие здоровью кровеносных сосудов. А, как известно, плохая работа сосудов является ранней стадией развития сердечно-сосудистых заболеваний, в том числе ишемической болезни сердца.

В ходе эксперимента добровольцы в течение месяца пили какао с разной концентрацией полезных флаванолов. В результате было установлено, что потребление какао с высоким уровнем содержания флаванолов снижает систолическое артериальное давление, которое является важным фактором риска развития сердечных болезней и инсульта, а также улучшает функции кровеносных сосудов на 47 процентов.

КРИМИНАЛ

Раскрыта схема убийства киллером вора в законе Япончика у московского ресторана

Генпрокуратура России направила в суд обвинительное заключение по делу об убийстве в 2009 году вора в законе Вячеслава Иванькова, известного в криминальных кругах как Япончик.

В обвинительном заключении, в частности, описаны подробности подготовки покушения на криминального авторитета. В организации убийства обвиняют вора в законе Илью Симонию (Махо), который пошел на преступление ради передела сфер влияния в преступном сообществе.

Для этого Симония привлек группу людей, которые в течение нескольких месяцев вели скрытое наблюдение за Иваньковым, устанавливая его привычки, контакты и маршруты передвижения. Сообщники выяснили, что Иваньков часто посещает ресторан "Тайский слон" на Хорошевском шоссе, и подобрали удобное место для стрельбы недалеко от этого заведения.

28 июля 2009 года Каха Газзаев, Муртази Шадания, Нугзар Папава и Джамбул Джанашия прибыли к ресторану и стали вести наблюдение за вором в законе. Когда Иваньков выходил из заведения, к нему подъехала «Газель», и находившийся в ней Астамур Бутба несколько раз выстрелил в Япончика. Он скончался от ранений в больнице в начале октября.

Газзаев, Шадания и Джанашия обвиняются по пунктам «ж» и «з» части 2 статьи 105 («Убийство»), а также части 3 статьи 222 («Незаконный оборот оружия и боеприпасов») УК РФ. Всем троим избрана мера пресечения в виде заключения под стражу. Симония, Папава и Бутба скрылись от следствия и объявлены в международный розыск.

19 января сообщалось, что следователи совместно с сотрудниками Московского уголовного розыска установили киллеров, застреливших в 2009 году вора в законе Япончика.



Вячеслав Иваньков.

РАЗОБЛАЧЕНИЕ

Как «продавцы рейтингов» развели Александра Лукашенко

Помните, с какой помпой подавался анонс социологического исследования по общественно-политической проблематике, инициированного властями. Александр Лукашенко с упоением говорил, что для проведения такого масштабного опроса приглашаются самые квалифицированные специалисты. И при этом заявил об участии в социсследовании украинских социологов.

Какой же результат?

Ну, провел Александр Лукашенко «масштабное социологическое исследование», опубликовали его пропагандисты немыслимые цифры якобы существующей ныне народной любви к нему и поддержки его действий. И что, сейчас же все граждане Беларуси должны поверить в появившиеся из ниоткуда цифры, одобряющие нынешнюю деятельность последнего диктатора Европы (кстати, он сам не раз так называл себя)? Поверив после провальных результатов выборов, фальсификаций итогов голосования, беспрецедентных по массовости для Беларуси акций протестов, после убийств и избиений, тюрем, увольнений, издевательств над протестующим народом?



Что, после всего этого народ вдруг воспылал горячей любовью к своему, скажу откровенно, мучителю? «Бьет – значит, любит», «стокгольмский синдром»? Отнюдь. Это как на выборах: «*Не важно, как проголосовали, – важно, как подсчитали*». Так и в случае с «масштабным социологическим исследованием». Чтобы убедить в правдивости результатов, пригласили из свободной демократической Украины якобы авторитетную организацию – **«Фонд украинской политики»**, которая, мол, всё правильно может посчитать и интерпретировать для непонятливого белорусского народа.

У критически мыслящего человека сразу возникает вопрос: что же это за организация такая, какой у нее бэкграунд, можно ли ее исследованиям доверять, в каком свете она предстает непосредственно в Украине?

А репутация у «Фонда украинской политики» не то что подмочена, ее попросту нет. В Украине эта организация давно входит в список псевдосоциологов **«Продавцы рейтингов»**, который ведется с 2015 года независимым изданием *Texty.org.ua* – лауреатом Национальной премии «Высокие стандарты журналистики – 2019» в категории «За устойчивый, качественный медийный проект».

Журналисты в рамках своего проекта, способствующего разоблачению манипулятивных технологий, используемых политтехнологами-шарлатанами, собрали данные о 114 псевдосоциологических службах и 214 скрытых пиарщиках, которые в Украине обнародовали или комментировали сомнительные социологические исследования и их результаты в течение последних 15 лет.

«Фальшивость» исследований журналисты определяли комплексно по нескольким критериям.

Первый – отсутствие упоминаний об исследовании организации в период между выборами. Неожиданное появление и исчезновение социологической компании.

Второй – непубличные связи основателей и публичных спикеров «социологических» организаций с политиками и политическими проектами.

Третий – распространение информации о псевдосоциологических исследованиях.

Четвертый – расхождение между объявленными прогнозами и результатами голосования.

В Украине авторитетных социологических компаний, результатам исследований которых можно доверять на самом деле, не так много. Хватит пальцев одной руки, чтобы пересчитать, кто проводит качественный политический замер настроений общества. И все они имеют аккредитацию Социологической ассоциации Украины, а также являются членами авторитетных международных социологических организаций и работают с соблюдением международных стандартов, утвержденных кодексами ESOMAR и WAPOR.

Безусловно, методика исследований этих авторитетных украинских социологических групп открыта и постоянно находится под международным мониторингом. И, конечно же, «Фонд украинской политики» не числится ни в национальной профильной ассоциации, ни в международных социологических организациях, но зато прочно обосновался в списке «Продавцов рейтингов».

Кто только не пользовался их услугами на протяжении последних 10 лет! Это и почетный президент «Укргазбанка» Василий Горбаль, экс-депутат парламента от Партии регионов, отметившийся призывом к Вселенскому патриарху Варфоломею не давать Томос Православной церкви Украины. Это и экс-депутат от тех же «регионалов» Наталья Королевская, запомнившаяся судебным иском к действительно авторитетным украинским социологическим компаниям и требующая от суда запретить публиковать результаты их исследований, вероятно, отличных от тех, что представлялись «Фондом украинской политики». Это и беглый президент Виктор Янукович со своим покинувшим страну окружением. Это и политические аутсайдеры последних президентской и парламентской избирательных кампаний: Александр Вилкул из Оппозиционной блока и Олег Ляшко – лидер Радикальной партии, которых патронировал украинских олигарх Ринат Ахметов.

Ушлые ребята из «Фонда украинской политики» тщетно пытались завышать и натягивать им рейтинги. В итоге манипуляции не принесли успеха, что привело к краху и политическому забвению их клиентов. Теперь настал черед Александра Григорьевича Лукашенко...

Александр ЦЫНКЕВИЧ,
собственный корреспондент газеты «Народная Воля» в Украине.



100 РАДКОЎ

Міхася СКОБЛЫ

Харакіры Уладзіміра Гасцюхіна

У старажытнагрэчаскага байкара Эзопа ёсць байка пра селяніна, які араў зямлю і падабраў у разоры напаўжывую ад холаду змяю. Ён пашкадаваў яе, паклаў за пазуху і працягваў сваю цяжкую працу. Змяя адагрэлася, акрыяла і ўджаліла свайго выратавальніка. З тае пары выраз "прыгрэць на грудзях змяю" стаў азначаць крайнюю ступень няўдзячнасці, калі за дабро разлічваюцца злом. Калі, па-народнаму кажучы, за наша дабро ды нам у рабро.

Эзопаву байку я згадаў, прачытаўшы нядаўняе інтэрв'ю народжанага на Урале, але даўно жывучага ў Беларусі кінаакцёра Уладзіміра Гасцюхіна расійскаму Федэральнаму агенцтву навін. Многае ў тым інтэрв'ю мяне, мякка кажучы, здзівіла. Напрыклад, сцвярджэнне пра тое, што *"80 процентов белорусов считают себя русскими"*. Адкуль узята гэта лічба? Паводле афіцыйнага перапісу, рускіх у Беларусі трохі больш за 8 працэнтаў. 8, а не 80! Хіба Гасцюхін правёў нейкі свой патаемны перапіс, падмяніўшы сабой Дзяржаўны статыстычны камітэт?

Статыстыка заўсёды на паслугах у палітыкі, таму высмактаныя з пальца 80 працэнтаў акцёр агучыў відавочна з пэўным разлікам і інтарэсам. Ён яго і не прыхоўвае, заявіўшы ў тым самым інтэрв'ю: *"Я русский и веду в Белоруссии политику русского человека"*.

Калі б гэта заявіў пасол Расіі, ніхто б не запярэчыў. Але Гасцюхін, прабачце, грамадзянін Беларусі. І не проста грамадзянін, а народны артыст. І вось гэты народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, уганараваны найвышэйшай дзяржаўнай узнагародай Беларусі – ордэнам Францыска Скарыны, – дэманстратыўна прызнаецца, што, жывучы ў Беларусі, служыць другой дзяржаве. Ды з любой другой краіны пасля падобных заяў ён вылецеў бы, як корак з бутэлькі!

Гасцюхін не вылеціць. Ён тут укараніўся і пачуваецца гаспадаром. Даволі звяглівым – любіць сваіх жа суграмадзян (жывых і памерлых) паліваць брудам. Вось яскравы прыклад з таго ж інтэрв'ю: *"Люди, с которыми я дружил, вдруг "переобулись в воздухе" и стали нацистами. Когда Василь Быков заявил, что "воевал не на той стороне", то перестал для меня существовать"*.

Як бачым, Гасцюхін не толькі "пераабуў" Быкава, але і "пераадзеў" – у нацысцкую форму. Ледзь "шмайсера" ў рукі не даў... Касцюмер, а не акцёр. Але падобны рэквізіт яўна не для Быкава. Быкаў – на другім (нямецкім!) баку? Ды яшчэ і сам пра гэта "заяўляў"? Большай бязглуздзіцы і ўявіць немагчыма.

Мёртвым, як вядома, не баліць. Баліць жывым. Зневажаючы Быкава, хлусячы пра яго вайну "не на той стороне", Гасцюхін зневажае ўвесь беларускі народ, чым голасам – праўдзівым і чутным у свеце – быў народны і званнем сваім, і сутнасцю сваёй пісьменнік.

У выпадку з Быкавым праз вусны Гасцюхіна сыкала ўсё тая ж змяя з байкі. Бо менавіта дзякуючы быкаўскаму "Сотнікаву", выканаўшы ролю Рыбака ў знакамітым фільме Ларысы Шапіцька, і ўвядоміўся малады акцёр. Той фільм і дагэтуль застаецца ці не галоўным дасягненнем Гасцюхіна ў кінематографе. Відаць, і сам ён гэта разумее, ведаючы, што на пуставатых "Дальнабойшчыках" далёка ў кіно не заедзеш, хоць сем працягаў здымі. Ведае і плявузгае пра Быкава несусветную лухту. Такое адчуванне, што акцёр так ужыўся ў ролю здрадніка Рыбака, што здрадніцтва стала для яго нормай жыцця.

У перакуленым з ног на галаву свеце Гасцюхіна ў Беларусі на пачатку незалежнасці *"вырастал местечковый нацизм"* і *"очень опасный скрытый фашизм"*, не зжыты, па яго перакананні, да нашых дзён. *"Они ненавидят меня, эти нацисты!"* – ваяўніча ўскліквае, нібы з акопа Другой сусветнай, акцёр-палітык. І на ўсю Расію скардзіцца на няўдзячных беларусаў-русафобаў, якія не далі яму разгарнуцца на поўную моц – не дазволілі стварыць яшчэ адзін рускі тэатр у Мінску і зняць на "Беларусьфільме" задуманыя па рускай класіцы кінашэдэўры.

Хай таго пярун спаліць, хто сам сябе хваліць – гаворыць беларуская прыказка. Гасцюхінскія самаўсхваленні мне, прызнацца, да лямпачкі. Абурае мяне тое, як паміж самаўсхваленнямі ён лепіць з сябе няшчасную ахвяру. Атрымаўшы ад Беларусі ўсе магчымыя ўзнагароды, акцёр, няйначай блытаючы рэальнае жыццё са здымачнай пляцоўкай, правёў праз усё інтэрв'ю выразны лейтматыў – як цяжка тут жывецца рускім, маўляў, дойдзе да таго, што *"мне придется уезжать, меня просто убьют"*.

Ніхто на жыццё Гасцюхіна не рабіў замаху і не збіраецца рабіць. Пакуль што "забівае" ён сябе сам – падобнымі антыбеларускімі інтэрв'ю. Як той японскі самурай, які не хоча служыць новаму гаспадару. Аднак на каго разлічана гэта казачка пра белага бычка? А яна зусім не бяскрыўдная, калі прыгадаць падзеі на ўсходзе Украіны, дзе ў патрэбны час з'явіліся расійскія "дабравольцы", каб абараніць рускіх на Данбасе ад кіеўскіх "нацыстаў" і львоўскіх "бандэраўцаў". Дарэчы, ва Украіне Гасцюхін – persona non grata – за падтрымку данецкіх сепаратыстаў. Там з такімі дзеячамі не цацкаюцца.

У нас – цацкаюцца. Можна і па Быкаву патаптацца, і ў рускія ледзь не ўвесь народ запісаць, і абзываць фашыстамі-нацыстамі ўсіх, хто не ўспрымае "русский мир", і пры гэтым – быць народным артыстам Беларусі. Ці не пра такіх, як Гасцюхін, трапна сказана ў вядомым "Сказе пра Лысую Гару": *"Калі другі артыст народны / Не знаў і двух народных слоў, / Затое меў тут харч нязводны / І ўволю цешыўся з аслоў"*.

Што ж, бываюць артысты народныя, а бываюць і няродныя. Розніца – адна літара. Расійскі горад Свярдлоўск (цяпер Екацярынбург) даў Беларусі двух народных, двух Уладзіміраў – Мулявіна і Гасцюхіна. Першы праславіў беларускую песню на ўвесь свет, за што Беларусь будзе яму ўдзячна яшчэ тысячу гадоў. А другі, фармальна народны, а насамрэч няродны, "маючы тут харч нязводны", з усіх сіл напінаючыся, спрабуе цягнуць Беларусь у пуцінскую Расію, носячыся, як з пісанай торбай, са сваёй нібыта пакрыўджанай і заціснутай тут рускасцю.

І няўцям народнаму-няроднаму, што, зневажаючы беларусаў, якія яго, колішняга госця здалёку, шчыра прытулілі і далі месца ва ўласнай хаце, ён прыпадабняецца да той Эзопавай змяі, што скіравала сваё джала ў сэрца аратага...

ПАЛІТКУХНЯ

Хто стварае ў Беларусі прарасійскую партыю «Саюз»

*У Мінску спрабуюць зарэгістраваць прарасійскую партыю «Саюз». Старшынёй партыі збіраецца быць **Сяргей Лушч**. Вось што пра яго вядома.*

Аргкамітэт будучай партыі «Саюз» стварылі 18 кастрычніка. У яго апроч старшыні Сяргея Лушча ўвайшлі каля 40 прарасійскіх актывістаў. На ўстаноўчым з'ездзе выступіў «дэсант з Масквы»: дзеячы ДНР часоў Захарчанкі (былы міністр сувязі ДНР **Віктар Яцэнка**) і прадстаўнік Севастопаля **Аляксандр Казакоў**. Пакуль партыя не зарэгістравана.

Сяргей Лушч – часты госць дзяржаўнага тэлебачання, стваральнік «Румола», які актыўна прасоўвае ідэі інтэграцыі Беларусі і Расіі. Але ягоная біяграфія нашмат цікавейшая.



Прарасійскія актывісты Сяргей Лушч (злева) і Аляксей Дзермант.

Courtesy Photo

Стваральнік «славянскага патрыятычнага блока» скінхэдаў

На пачатку 2000-х у Мінску існавала мноства нефармальных асяродкаў. У сталіцы па тэрытарыяльным прынцыпе ўтвараліся блокі скінхэдаў – аб'яднанні моладзі з ультраправымі поглядамі. У адну з такіх брыгад у раёне Акадэміі навук уваходзіў будучы палітык Сяргей Лушч.

Як расказаў чалавек, знаёмы з тагачаснымі ультраправымі тусоўкамі, у блоку Лушча прасочваліся яўныя славянафільскія погляды: «магутная вялікая Русь з дамінуючай сілай – славянамі». Удзельнікі тусоўкі заўжды святкавалі 9 мая, выступалі супраць нацыянальных сімвалаў і апазіцыі.

Гэтыя звесткі пацвярджаюцца даследаваннем Isans. Вось што там пішуць пра Сяргея Лушча.

«Як вынікае з біяграфіі Лушча на закрытым цяпер сайце агенцтва неанацысцкага «Русского Лада» «Модус Агенди», ён з 2000 года быў актыўным удзельнікам моладзевага патрыятычнага руху і адным з заснавальнікаў моладзевай арганізацыі «Славянскі патрыятычны блок» (2002–2004). Апошні, паводле інфармацыі даследчыкаў, паўстаў з удзельнікаў «РНЕ» і груповак скінхэдаў. Паводле розных дадзеных, «Славянскі патрыятычны блок», сузаснавальнікам якога быў Лушч, быў таксама наўпрост звязаны з неанацысцкай паганскай сектай «Схорон Еж Славен», – пішуць аўтары даследавання.

Адзін з кіраўнікоў беларускай філіі «Схорон Еж Славен»

Таксама на пачатку 2000-х малады Сяргей Лушч падпадае пад уплыў расійскай неапаганскай арганізацыі «Схорон Еж Славен». Яе стваральнік **Уладзімір Галякоў**, які называе сябе Багуміл Другі Галяк ці Жрэц усіх славян, – ураджэнец Санкт-Пецярбурга.

Ідэі гэтага аб'яднання – кактэйль з паганства, славянафільства і дамінуючай ролі славян у Расіі, Украіне і Беларусі. Выказванні Галякова нярэдка адзначаюцца антысемітызмам і шавінізмам, дыскрымінацыяй і ксенафобіяй.

